
Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№41 (227). 11 —17 кастрычніка 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 200 руб.

Читайте на страницах "ГС"

Прыгажосць выратуе свет

Фота Віталя ГІЛЯ

На вуліцы – бабіна лета: цёпла, сонечна і ціха. Прыгажосць прыроды толькі падкрэслівае прыгажосць нашых дзяўчат і жанчын. І як бы цяжка сёння не было, а беларускія спадарыні стараюцца трымаць сябе "у норме", быць сімпатычнымі і элегантнымі. Ці не таму яны лічацца, бадай, ці не самымі прыгожымі ў свеце. А якія ў іх цудоўныя ўсмешкі! Усміхнулася жанчына – значыць, усё добра. Дзесьці чакае яе любімы і блізкі чалавек, які стараецца зрабіць, каб яна была яшчэ прыгажэйшай і шчаслівейшай.

"Прыгажосць выратуе свет", – сказаў класік. А гэтая прыгажосць, найперш, зыходзіць ад жанчыны. Значыць, жанчына і ратуе свет, ратуе нас, мужчын. Таму ў нашым жыцці яшчэ не ўсё дрэнна.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

АБ'ЯДНАЮЦЬ І ПРЫЗНАЧАЦЬ НОВАГА СТАРШЫНЮ

Як стала вядома карэспандэнту "ГС", 10-12 кастрычніка ў Гродзенскім аблвыканкаме павінна адбыцца нарада з удзелам прадстаўнікоў адміністрацыі прэзідэнта.

На пасяджэнне будзе вынесена пытанне аб аб'яднанні горада Слоніма і Слонімскага раёна. Дасведчаныя людзі сцвярджаюць, што кіраўніком новай слонімскай аб'яднанай адміністрацыі будзе прызначаны цяперашні старшыня мясцовага райвыканкама Мікалай Пахолак. Якая пасада чакае мэра горада Алега Лакцюшына, пакуль невядома.

Анатоль МІРСКІ

ПЫТАННЕ

ЦІ БУДЗЕ СКАРАЧЭННЕ НА СЛОНІМСКАЙ КПФ?

У рэдакцыю "ГС" пазваніла чытачка і папрасіла праз газету паведаміць, ці сапраўды на камвольна-прадзільнай фабрыцы чакаецца вялікае скарачэнне рабочых, і нават назвала лічбу — 500 чалавек?

Гэтае пытанне карэспандэнт пераадрасаваў галоўнаму інжынеру фабрыкі Мікалаю Жораву. Мікалай Сяргеевіч сказаў, што размовы і чуткі пра скарачэнне работнікаў на прадпрыемстве ходзяць даўно. Але тое, што павінны скараціць 500 чалавек — не адпавядае сапраўднасці. Скарачэнне на фабрыцы ідзе даўно. Найперш пад скарачэнне трапляюць тыя, хто парушае працоўную дысцыпліну, ужывае на працы спіртныя напоі і г.д.

Больш падрабязную інфармацыю Мікалай Жораў параіў атрымаць у аддзеле кадраў фабрыкі. Там карэспандэнту "ГС" паведамілі, што цяпер на прадпрыемстве працуе 2.108 чалавек. Пра скарачэнне адразу 500 рабочых размовы ніхто не вёў. Але пытанне гэтае існуе. У прыватнасці, плануецца скарачыць трэцюю змену. Але яна не скарачаецца з 1995 года. Хутка правесці такое скарачэнне немагчыма, бо кожнаму патрэбна заплаціць кампенсацыю. А дзе ўзяць грошы? Таму праблемы са скарачэннем на фабрыцы ёсць.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПЕРЫЯД ДЗЕЯННЯ "ЛЕТНЯГА" ЧАСУ завершыцца 28 КАСТРЫЧНІКА



У Рэспубліцы Беларусь завяршаецца перыяд дзеяння "летняга" часу.

Традыцыйна гэта апошняя нядзеля кастрычніка. У ноч на 28 кастрычніка ў 3 гадзіны стрэлкі пераводзяцца на 1 гадзіну назад. Як паведамілі ў Нацыянальным эталоне часу, частаты і шкалы Дзяржстандарта, з гэтага моманту рэспубліка пачынае жыць па "зімовым" часе.

НАВІНЫ

Слонімцаў больш памірае

За першае паўгоддзе 2001 года на Слонімшчыне памёрлі 542 чалавекі, а нарадзілася ўсяго 323.

Аб гэтым сказаў на сесіі Слонімскага гарадскога Савета дэпутатаў галоўны ўрач Слонімскага ТМА Юрый Пяцельскі. Часцей за ўсё людзі паміраюць ад сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў, а таксама ад захворванняў органаў дыхання.

Сяргей ЧЫГРЫН

Хутка ўключаць ацяпленне

Набліжаюцца халады, і ўсіх хвалюе пытанне ацяплення жылля.

Як паведамілі афіцыйныя крыніцы ў беларускім урадзе, ацяпляльны сезон пачнецца, калі ўстановіцца стабільнае халоднае надвор'е і тэмпература паветра на працягу пяці дзён не падымецца вышэй за 8 градусаў цяпла.

Валерый КАВАЛЕНКА

Неудержимый рост

После четырехмесячного перерыва в Беларуси вновь повышены цены на белую водку. На этот раз подорожание составило 5 процентов.

Теперь в розничной продаже пол-литровая "винтовая" бутылка водки "Кристалл-100" стоит 1.939 рублей (ранее — 1.851), "Белая Русь", "Кристалл-люкс" — 2.001 (1.910), "Белая Русь — люкс", "Кристалл-люкс новый" — 2.074 (1.979).

Нынешнее повышение водки стало седьмым в нынешнем году. С начала года водка подорожала на 31 процент.

БелаПАН

Праца прызнана незадавальняльнай

У мінулую пятніцу ў заводскім клубе "40 гадоў БССР" прайшоў пазачарговы сход акцыянераў ААТ "Мастоўдрэў".

На павестцы дня стаяла толькі адно пытанне: справаздача генеральнага дырэктара аб'яднання Віктара Бурага "Аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці таварыства за 6 месяцаў 2001 года". Фінансавы стан прадпрыемства цяжкі. Аб гэтым засведчыў генеральны дырэктар у сваім дакладзе. Як канкрэтна паправіць становішча, ён не сказаў. З рэзкай крытыкай гаспадарчай дзейнасці Віктара Бурага выступілі былы галоўны інжынер ААТ "Мастоўдрэў" Леанід Пікуль і кіраўнік нагляднальнага аддзела Аркадзій Шарапа. Старшыня райвыканкама Аляксандр Кісялёў актыўна адстойваў лінію генеральнага дырэктара. Праца генеральнага дырэктара ў гэтым накірунку прызнана незадавальняльнай. Пытанне кадравых зменаў на сходзе не ставілася, паколькі не былі выканы юрыдычныя фармальнасці: не змешчана ў друку аб'ява аб кадравых зменах у кіраўніцтве. Дзякуючы пазачарговаму агульнаму сходу акцыянераў, рабочыя, урэшце, атрымалі заработную плату за жнівень. Як заўжды, утварыўся натоўп. Людзі ў чарзе стаялі па 5 гадзін. У дзень сходу праца касаў была падоўжана да 21 гадзіны.

Язэп ПАЛУБЯТКА

РЕПОРТАЖ

НЕ ГРУБИТЕ СОТРУДНИКУ ГАИ, КОГДА ОН НА СЛУЖБЕ

Думаю, каждый водитель знает, что если встречная машина "моргает" ему фарами, то значит где-то недалеко находятся сотрудники ГАИ. И тогда водителю остается подготовиться к встрече или надеяться, что его не остановят... Но надежды не всегда сбываются.

Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Сотрудники ГАИ во время работы

Корреспондент "ГС" решила подежурить с сотрудниками ГАИ, чтобы поближе узнать все "прелести" этой профессии.

"Ну, пожарной я уже как-то была, теперь надо бы и милиционером себя почувствовать", — рассуждала я, вовсе не предполагая, ЧТО меня ждет во время несения службы.

А начиналось все с того, что меня "закрепили" за 14 машиной в составе старшего сержанта Дмитрия Мороза и сержанта Александра Надудика. Я пообещала ребятам ни во что не вмешиваться, а про себя подумала: "Ничего в их работе особенного нет — знай только останавливай машины, а там уже найдется, за что дать штраф". Позже поняла, как я ошибалась.

В 17 часов мы поехали на "условленное" место: на ул. Советскую, в район вокзала. Я откровенно скучала, когда Дмитрий и Александр наказывали слонимчан за провинности: у одного страховка не продлена, у другого — маленький ребенок на первом сидении... Какую-то женщину оштрафовали за невнимание к знакам дорожного движения: она развернулась в неположенном месте. Тут и пришлось старшему сержанту Дмитрию Морозу выслушать целую тираду о том, что в Слониме вообще невозможно нормально ездить, так как многие знаки закрывают ветви деревьев, и дороги у нас плохие.

Оштрафованная женщина ушла расстроенная и возмущенная. "В Слониме уже давно нет порядка", — эту фразу она оставила нам на прощание.

"И часто вот так болезненно реагируют водители?" — спросила я у Дмитрия и Александра. "Бывают случаи и похуже", — ответили ребята.

На десятой остановленной машине я уже перестала считать, сколько же слонимчан "попалось" за несоблюдение правил вождения. К восьми часам вечера мы решили поменять место "засады". Поехали в район улицы Гагарина. Там было интереснее: какой-то мужчина не остановился на выкинутый жезл, поэтому пришлось его догонять. Я втайне надеялась на то, что это какой-нибудь особо опасный преступник и я буду присутствовать в момент его задержания... Моему разочарованию не было предела, когда из машины вышел дедушка, который просто не заметил сигнал сотрудников ГАИ.

Где-то в часов одиннадцать вечера мы поменяли место дислокации. Поехали в район ресторана "Слонимский". На улице к этому времени похолодало. Я сидела в теплом салоне и не вникала, что происходит за пределами патрульного автомобиля. Вдруг переднюю дверь отрыл какой-то мужчина (назовем его С.), сел на сидение. "Отпустите, мне две минуты осталось доехать до дома", — стал проситься С. "Не положено, — сказал старший сержант Дмитрий Мороз. — Сколько раз Вы уже попадаетесь в нетрезвом состоянии?" "Да уже раз в девятый", — с гордостью продолжал С. Он все еще надеялся на прощение, но когда услышал, что его собираются везти в больницу на медицинскую экспертизу... Мужчина, мягко выражаясь, возмутился, выложив весь свой запас нецензурных слов. "Вы знаете хоть, с кем имеете дело? — спросил он у Дмитрия. — Потом сильно пожалеете, если не отпустите меня". Дмитрий и Александр были невозмутимо спокойны, чего я не могла сказать о себе. С. продолжал: "У меня есть деньги, поэтому я могу позволить себе ездить выпившим. Завтра я опять выпью и сяду за руль...". Меня трясло от возмущения, но я ведь обещала не вмешиваться, поэтому молчала. До самой больницы С. оскорблял милиционеров, угрожал расправиться, если не отпустят. "Я не привык ездить на такой развалюхе, как ваша, — заявил С. на полпути, — такие машины не для меня". Наконец-то мы добрались в Альбертин. В больнице С. продолжал свой монолог: "Я не буду дышать в трубку, везите меня в камеру". К моему большому сожалению, его просьбу не выполнили. Я поражалась терпению Дмитрия и Александра, они так спокойно выслушивали С.

Эта история закончилась тем, что машину С. отогнали на пост ГАИ, составили протокол. "Мне все равно, что вы делаете. Главное, что у меня есть деньги и завтра машина опять будет у меня", — не сдавался задержанный.

Позже мы вновь вернулись на прежнее место возле ресторана.

Меня поразили двое мужчин, которые были оштрафованы по одной и той же причине — за отсутствие при себе технических документов на автомобиль. Один пытался угрожать, говоря, что "потом вам плохо будет", а второй просто окончательно выбил меня из колеи. Он сказал: "Я сын Надежды Васильевны, что не знаете?" По-моему, это уже совсем из ряда вон выходящее. Надеюсь, этот мужчина не будет так всю жизнь прятаться за спину своей мамы.

Много всего произошло в тот день, когда я дежурила с Дмитрием и Александром. "Как хорошо, что я не работаю в ГАИ", — подумала я уже после смены. Мои нервы просто не выдержали бы такого отношения со стороны наших водителей. Угрозы в адрес милиционеров сыпались почти через одного человека. Потом, я просто уверена, большинство задержанных будут утверждать, что их оштрафовали совершенно незаконно. У них есть право обжаловать действия милиционеров в течение 10 дней. Вот только укажут ли они в своих жалобах все свои угрозы в адрес работников ГАИ?

Всем сотрудникам госавтоинспекции от себя хочу пожелать и дальше сохранять терпение при общении с задержанными.

Ольга ШИНКЕВИЧ

P.S. Особую благодарность в подготовке этого репортажа корреспондент "ГС" выражает начальнику ГАИ Василию СУПРУНУ, старшему сержанту Дмитрию МОРОЗУ и сержанту Александру НАДУДИКУ.

НАВІНЫ

Абяцалі Інданэзію — аддзячылі лістамі

Старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксандр Кісялёў не стрымаў свайго слова.

Адразу пасля выбараў прэзідэнта РБ ён аб'явіў, што паколькі старшыні ўчастковых выбарчых камісій спрацавалі на "выдатна", то зараз яны могуць браць пуцёўкі і ехаць адпачываць хоць у Інданэзію. Пабачыць экзатычныя краіны людзі так і не змаглі. Адзінае, што яны атрымалі, то гэта падзячныя лісты, падпісаныя старшынёй райвыканкама.

Рашэнне аб узнагароджанні старшыняў камісій і некаторых іх намеснікаў прымаў асабіста Аляксандр Кісялёў.

Адзінае выйсце— фізічная расправа

Улады Шчучынскага раёна працягваюць запалохваць Тацццяну Смола.

Як ужо паведамляла "ГС", супрацоўнік Шчучынскай гарадской бібліятэкі Таццяна Смола ўдзельнічала ў незалежным назіранні на мінулых выбарах прэзідэнта РБ. Гэта не спадабалася мясцоваму кіраўніцтву, і намеснік старшыні райвыканкама Дубок затрабаваў яе звальнення. Жанчына адмовілася пісаць заяву, каб сысці з працы па ўласнаму жаданню. Надалей гэтыя прапановы Смоле рабіліся штодня на працягу месяца. Але адказ быў адзін і той жа. Цярпенне ў шчучынскай вертыкалі, відаць, скончылася. Жанчыне пачалі тэлефанаваць вечарам невядомыя асобы і пагражаць фізічнай расправаю. А нядаўна прадстаўнікі ўлады прапанавалі ёй увогуле з'ехаць з горада і паабяцалі прапіску ў любым населеным пункце вобласці па яе жаданню.

Доктар, распішыся за мыла

Кіраўніцтва Мастоўскага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання абавязала дактароў засведчываць факт атрымання звычайнага мыла сваім подпісам.

Такім чынам адміністрацыя бальніцы спрабуе трымаць пад кантролем гаспадарчыя выдаткі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Показали себя и на других посмотрели

В Гродно во Дворце культуры химиков прошла III международная выставка-ярмарка "Еврорегион Неман — 2001".

В выставке приняли участие около 30 субъектов хозяйствования из Беларуси, Литвы и Польши. С белорусской стороны, кроме гродненских предприятий, в мероприятии приняли участие предприятия из Минска и Полоцка (Витебская область).

Во время трехдневной работы выставки производители трех стран провели презентации своей новой продукции — одежды, промышленного и сельскохозяйственного оборудования, продуктов питания, аудио-, видео- и фототехники, мебели. В качестве культурной программы был показ мод модельного агентства "Юни-арт" и выступили самодеятельные художественные коллективы.

Павел МОЖЕЙКО

НАВІНЫ

Адзін душ на ўсю вёску

Мабыць ніколі не наблізіць нам якасць сялянскага жыцця да жыцця ў горадзе. І нават не аб культуры адпачынку размова, бо тэатры, палацы спорту, рэстараны і сучасныя дыскабары непатрэбныя, калі няма лазні.

А ў вёсцы Сялявічы лазня ёсць, але ж яна не працуе. Адказныя людзі, якія хаваюцца за подпісам "адміністрацыя", кажуць, што няма паліва, хаця да бліжэйшага лесу 400 метраў.

А дзе памыцца працаўніку пасля праведзенага ў полі, на ферме дня? Ёсць у мехмайстэрнях душ. Вось там усе і мыюцца па чарзе, групамі па некалькі чалавек і вельмі хуценька, бо працуе той душ — па загаду ўсё той жа "адміністрацыі" — усяго толькі паўтары гадзіны ў дзень.

Затое па-суседству, у вёсцы Юхнавічы, лазня працуе спраўна. І нават парылка там ёсць. Таму што ёсць у лазні гаспадар Андрэй Грыцко, зацікаўлены ў добрай якасці сваёй працы, і клопат аб аднавяскоўцах для яго — справа асабістага гонару.

Валерый КАВАЛЕНКА

Юбілей

Нядаўна споўнілася 25 гадоў Наваельнянскай музычнай школе, што ў Дзятлаўскім раёне.

За гэты час яе закончылі 243 выпускнікі. Цяпер у музычнай школе займаецца 111 вучняў па спецыяльнасцях: духавыя інструменты, баян, цымбалы, домра, фартэпіяна. Школа мае філіял у вёсцы Дварэц. На працягу чвэрці стагоддзя дырэктарам з'яўляецца Валянціна Мікалаеўна Малахава.

Днямі адзначыла свой юбілей і Дзятлаўская школа-інтэрнат, ёй споўнілася 40 гадоў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Рыдлёўка замяняе сякеру

Мастоўскае ўнітарнае прадпрыемства МПМК-155 рыхтуецца да прыезду камісіі.

З гэтай нагоды рабочым атрымалі загад высечы кусты на тэрыторыі прадпрыемства. Толькі для выканання гэтае працы не знайшлося звычайнай сякеры. Усе ж заданне рабочыя выканалі. Сякеры замянілі рыдлёўкі.

Дэбет з крэдытам не сходзіцца

Крэдыторская запазычанасць у калгасах і саўгасах Мастоўскага раёна на сённяшні дзень складае 4,9 мільярда рублёў.

Пазыка перавышае дэбетарскую запазычанасць у цэлым па раёну ў 10 разоў. А ў некаторых гаспадарках як "Маяк", "Шчара" — у 26 разоў і болей.

Не ў згодзе з коштам

Дзяржкантроль Гродзенскай вобласці правёў праверку цэнаўтварэння суб'ектамі гаспадарання.

У мастоўскім раёне парушальнікамі выяўлены калгасы "Маяк", "Дубна", "Шчара". У прыватнасці, калгас "Дубна" завысіў кошт рэалізаванай прадукцыі на 23 млн. рублёў, а "Шчара" — 10 млн. рублёў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЭСЭ

ЗА САВЕЦКІМ ЧАСАМ

Калі чуеш выказванні "за польскім часам", "пры немцах", "пры першых саветах", то з гістарычнага далягляду Заходняй Беларусі тут усё зразумела. Пахадзілі, патапталіся па нашай зямлі розныя "дабрадзеі", і народ у двухтрох словах даў назву часу іх панавання. Але калі сёння хтосьці пачынае свой аповед са слоў "было гэта яшчэ за савецкім часам", міжволі ўзнікае пытанне: калі, за якімі гэта саветамі? Бо савецкі час у Беларусі яшчэ не скончыўся, і Саветы, як намінальныя органы ўлады, хоць і фармальна, але існуюць, а сярэдні беларус па сваёй свядомасці — гэта ўсё яшчэ савецкі чалавек. Тым не менш, менавіта з падпісання ў Віскулях Белавежскіх пагадненняў скончылася гістарычная савецкая эпоха (што і нарадзіла выказванне "за савецкім часам" у прошлым часе). Але сістэма, на якой трымаўся Савецкі Саюз, працягвала працаваць.

Гісторыя маладога чалавека (назавем яго Андрэй) прыходзіцца на самы пачатак 90-х гадоў мінулага стагоддзя і пралівае святло на работу механізмаў савецкай грамадскай машыны.

Андрэй выдатна скончыў сярэднюю школу і цвёрда вырашыў стаць ваенным юрыстам. Прычым, малады чалавек настолькі быў упэўнены ў сваіх сілах і ведах, што неадкладна прыступіў да ажыццяўлення сваёй мары. А задача перад учарашнім школьнікам стаяла не простая. Для таго, каб дапусцілі здаваць экзамены на юрыдычны факультэт Маскоўскай ваеннай акадэміі, патрэбна было прайсці розныя камісіі, субяседаванні, спецправеркі. Для хлопца з беларускага правінцыйнага гарадка, з самай што ні на ёсць шараговай сям'і, які акрамя залатога медаля і выдатнага фізічнага здароўя, больш, як кажуць, за душой нічога не меў, "селекцыйны" адбор быў самы строгі. Ды і як інакш: у войску не служыў, не патомны ваенны і нават не з сям'і савецкіх юрыстаў, а адразу замахнуўся на "асабіста"! (Асабовыя аддзелы вайсковых частак колішняй Савецкай Арміі, у асноўным, камплектаваліся афіцэрамі-выпускнікамі ваенных юрыдычных факультэтаў). І тым не менш, Андрэй прайшоў першы круг адбору і быў допушчаны да здачы ўступных экзаменаў у акадэмію. А калі здаў усе дысцыпліны на "выдатна", то на 100% быў упэўнены, што паступіў. Нават тады, калі не знайшоў свайго прозвішча ў спісе прынятых на вучобу і накіраваўся ў прыёмную рэктарата для высвятлення, як ён тады лічыў, недарэчнай памылкі. Але памылкі, як аказалася, не было. У рэктарацы высокі вайсковы чын павіншаваў хлопца з выдатнай здачай экзаменаў, але паведаміў, што на вучобу ў іх установу ён, на жаль, прыняты быць не можа — не прайшоў спецправерку. Калі Андрэй спаслаўся на тое, што і ваенкамат, і адпаведныя органы па месцу жыхарства яго правяралі і выдалі паперку, што з іх боку ўсё добра (чытай — благанадзейны), яму адказалі катэгарычна: "У Вашай блізкай сваячніцы, бабулі, ёсць судзімасць. Таму Вы нам не падыходзіце". І больш нічога не сказалі, і не мела для іх значэння, што бабуля Андрэя на той час ужо памёрла. Праверылі, значыць, са свайго боку, усіх родзічаў абітурыента, і жывых, і мёртвых, не асабліва давяраючы беларускім калегам з правінцыі. А яшчэ ж існаваў тады СССР! Для Андрэя, аднак, гэтая судзімасць бабулі была поўнай нечаканасцю, бо ён дакладна ведаў, што яна ніколі ў турме не сядзела.

Адчуваючы сябе ашуканым, абрабаваным сярод белага дня, вярнуўся хлопец з Масквы ў Беларусь. Але і ад бацькоў не даведаўся, за што і калі судзілі бабулю. І ўсё ж настырны юнак дазнаўся праўду ў гэтай гісторыі, якая бумерангам закранула і яго лёс.

Разгадка хавалася ў архіве мясцовага суда. Калі Андрэй пераступіў парог гэтай сур'ёзнай установы і расказаў пра мэту свайго візіту, яму пайшлі насустрач і знайшлі-такі ў архіве справу (шматгадовай даўніны) яго нябожчыцы-бабулі. І было напісана ў той судовай справе — хоць стой, хоць падай! — што тады і тады жыхарка вёскі М., грамадзянка такая і такая пасварылася з суседкай з-за курыцы і была пакарана за гэта штрафам у 20 савецкіх рублёў. Мела-такі бабуля судзімасць! І савецкая грамадская машына, якая прызваная была рэгуляваць узаемадачыненні паміж бацькамі і дзецьмі, а таксама ўнукамі і дзядамі, спрацавала бездакорна. А ўвогуле, гісторыя Андрэя "за савецкім часам" нагадвае вядомы анекдот той пары.

Малы сын пытаецца ў бацькі-палкоўніка:

— Тата, а я, як вырасту, буду лейтэнантам?

— А чаму ж не, будзеш, сынок.

— А капітанам?

— Будзеш.

— А палкоўнікам?

— І палкоўнікам будзеш.

— А генерам буду?

— Не, сынок, генералам не будзеш. У генерала свой сын падрастае...

Цяпер мы жывем у фармальна незалежнай краіне. Вялікая імперыя зла са сваімі адладжанымі механізмамі грамадскіх адносін зрынулася. І хоць, па сутнасці, і па сённяшні дзень мы недзе там — за савецкім часам, эпахальныя змены ў свеце закранулі і Беларусь. Не стала такой жорсткай уладнай іерархіі. Канешне, сын трактарыста і за нашым новым старым часам хутчэй за ўсё становіцца трактарыстам, а сын дырэктара, рана ці позна, "вырастае" да дырэктара. Але ж Беларусь, можа як не адна краіна на ўсёй постсавецкай прасторы, паказала свету, на якія вышыні здольныя сягнуць выхадцы з народа, так званыя выскачкі. Шкада толькі, што жыцце і лёс чалавека і ў наш час не сталі да гэтага выключэння з правілаў каштаваць больш за 20 савецкіх рублёў.

Мікола КАНАНОВІЧ

КАК ТОЛЬКО, ТАК СРАЗУ...

Вот уже почти четыре года Любовь Николаевна Маскимчик обращается в ЖЭС-2 с одним и тем же вопросом: "Когда же в доме по Тополевой, 27/1 сделают крышу, чтобы мою квартиру не заливала вода?".

"Вот несколько недель назад приехали рабочие из ЖЭСа. Они немного поработали, а потом их забрали на другой объект в Жировичи", — говорит Любовь Николаевна.

От сырости и влаги обои в одной из комнат отваливаются. "Их нужно постоянно подклеивать. А денег, чтобы сделать ремонт, у меня нет", — продолжает женщина.

Для того, чтобы потолки не разъедала сырость, рабочие ЖЭСа посоветовали замазать их медным купоросом. Теперь потолки в квартире Любви Николаевны зеленоватого цвета. "Стыдно когонибудь в гости пригласить", — говорит хозяйка квартиры.

Чтобы выяснить, когда все-таки отремонтируют крышу в доме по Тополевой, корреспондент "ГС" позвонила главному инженеру ЖЭС-2 Сергею Барбутько.

Так выглядит потолок в прихожей

"Действительно, существует такая проблема. Наша организация в прошлом году ремонтировала крышу в этом доме. И в этом году мы планируем сделать все возможное, чтобы квартиру Максимчик не заливало водой. Как только наши рабочие отремонтируют больницу в Жировичах, они постараются решить проблему с квартирой Любови Николаевны", — заверил Сергей Митрофанович.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ПРОБЛЕМА

НА НАШИХ УЛИЦАХ НЕ ГАСНУТ ФОНАРИ

Потому что они не зажигаются вовсе. Кроме центральных, так сказать, градообразующих улиц, свет фонаря в Слониме редко где увидишь.

А если кромешную тьму помножить на состояние наших дорог и тротуаров, да прибавить к этому не самые лучшие погодные условия наступающей зимы, то получим мы переломы рук, ног и других частей тела.

"Не засидится в седлах" и преступный элемент разных мастей. Так что многие честные люди, идя вечернею порою по улицам родного города, рискуют не досчитаться зубов, часов, кошельков и приобрести фонари, но уже под глазами.

В общем, Слоним после семи часов вечера становится сумеречной зоной, где возможно абсолютно все. А может, это политика такая, чтобы народ по домам сидел, а не шлялся где ни попадя перед грядущим рабочим днем.

Впрочем, все гораздо прозаичнее — пресловутая нехватка денег, которых у исполкома не хватает буквально на все, кроме зарплаты бюджетникам, — да и ту начали потихоньку задерживать.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЗДАРЭННІ

Затрымана бандыцкая групоўка

На мінулым тыдні слонімская міліцыя затрымала групу злачынцаў з Баранавічаў, якая займалася рабаўніцтвам.

Першага кастрычніка вечарам рабаўнікі ўварваліся ў дом, што па Зялёнай вуліцы і пачалі ў гаспадара патрабаваць грошы. Калі сталы мужчына адмовіў, яго стукнулі па галаве і сталі абшукваць пакоі. Нечакана ў гэты момант у дом зайшлі два хлопцы. Аднаго сведку таксама збілі, а другі паспеў збегчы і выклікаў міліцыю. Аператыўная група спрацавала прафесійна. Некаторыя бандыты былі арыштаваны адразу ў той жа вечар. Адзін са злачынцаў падчас затрымання спрабаваў выкарыстаць супраць міліцыянераў пісталет.

Цяпер вядзецца следства.

Падвальныя разборкі

У панядзелак, 8 кастрычніка, Слонімская пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факту нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

Абвінавачваемым з'яўляецца непаўнагадовы слонімскі юнак, які стукнуў нажом у спіну 16-ці гадовага хлопца. Здарылася гэта 3 кастрычніка ў падвале аднаго са шматпавярховых дамоў. Спачатку маладыя людзі паспрачаліся, а ў выніку адзін з іх выхапіў нож. Пацярпелы знаходзіцца ў траўматалагічным аддзяленні раённай бальніцы.

Валодзя ЯНЧУК

"Аўдзі" перабегла дарогу "Опелю"

У мінулую пятніцу ў Мастах на плошчы Леніна адбылося сутыкненне двух легкавых аўтамабіляў.

Шафёр "Аўдзі" нечакана павярнуў на стаянку да Дома Саветаў і сутыкнуўся з "Опелем". У выніку аварыі траўмы атрымалі дзве жанчыны — пасажыркі "Аўдзі". Яны былі шпіталізаваны.

Антон МАКЕЙ

Забілі і закапалі

Прыватны прадпрымальнік з Брэста, грамадзянін В., прыехаў у Дзятлаўскі раён нарыхтоўваць лес для вытворчых патрэб.

Як пазней высветлілася, пры сабе ён меў тысячу даляраў. Пра гэта ведалі мясцовыя жыхары, з якімі ў прадпрымальніка былі прыязныя адносіны. Як лічыць следства, амерыканскія грошы і сталі падставай для злачынства.

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі Дзятлаўскага РАУС знайшлі труп грамадзяніна В. ва ўрочышчы Слонімскага раёна Паўлаўскага сельсавета. Ён быў закапаны ў лесе на беразе затокі ракі Шчара. Судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла, што смерць наступіла ў выніку шматлікіх раненняў. Усяго на целе была выяўлена 21 рана.

Забойства злачынцы ўчынілі ноччу. Аўтамашыну пацярпеўшага яны адагналі ў Мастоўскі раён і спалілі ў лесе непадалёку ад вёскі Мехаўск, а каштоўныя рэчы гаспадара і грошы ўкралі. Пазней рэчы апазнала жонка пацярпеўшага.

Падазраваемыя ў забойстве арыштаваны, вядзецца следства. У раскрыцці гэтага злачынства вызначыліся многія супрацоўнікі Дзятлаўскага РАУС пад кіраўніцтвам начальніка міліцыі Анатоля Панкевіча, а таксама намесніка начальніка Слонімскага ГРАУС Генадзя Шлыковіча.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СТАРЕЕМ и ВЫМИРАЕМ

По демографическим прогнозам ООН и белорусских специалистов, к 2050 году население Беларуси может уменьшиться на 2 миллиона человек.

Об этом сообщила заместитель министра труда Беларуси Елена Колос. По её словам, выводы специалистов обусловлены тем, что, начиная с 1993 года, в Беларуси наблюдается такое явление как депопуляция; в результате численность населения страны уменьшилась почти на 300 тысяч человек.

Заместитель министра отметила, что характерными чертами обострения демографической ситуации являются сокращение рождаемости, рост смертности, старение населения, а также сокращение продолжительности жизни. В Беларуси за период с 1990 года коэффициент рождаемости снизился на 34,5 процента и составил 9,1 человека на 1 тысячу населения, уровень смертности за этот же период вырос на 26 процентов. На 2,7 года сократилась продолжительность жизни.

По словам Елены Колос, особенно интенсивно эти негативные тенденции проявляются в сельской местности, где средняя продолжительность жизни мужчин стала ниже законодательно установленного пенсионного возраста (60 лет). Как считают специалисты, если ситуация не улучшится, в ближайшие 40 лет на селе практически не останется трудоспособного населения.

Фота Віталя ГІЛЯ

Учитывая происходящие процессы, сказала Елена Колос, Палатой представителей Национального собрания разработан и принят в первом чтении проект Закона о демографической безопасности, который определяет задачи демографической безопасности, принципы ее обеспечения, устанавливает перечень демографических угроз и характеризующие их показатели.

Ольга ОСИПЕНКО

ОТ СПИДА УМЕРЛО 23 ЧЕЛОВЕКА

По состоянию на 1 октября количество ВИЧ-инфицированных в Беларуси составило 3.791.

Об этом БелаПАН сообщила главный врач Республиканского центра профилактики СПИД Лилия Мелешко. По числу зарегистрированных случаев по-прежнему лидирует Гомельская область, где на 100 тысяч жителей приходится 168,2 инфицированных.

По словам Лилии Мелешко, основным способом заражения является инъекционное введение наркотических веществ, однако в последнее время отмечается рост случаев передачи инфекции половым путем. Увеличивается и количество детей, рожденных от ВИЧ-инфицированных матерей.

На сегодняшний день в Беларуси зарегистрировано 155 летальных случаев среди ВИЧ-инфицированных, в том числе от СПИДа умерли 23 человека.

Ольга ОСИПЕНКО

ВЫРОСЛИ ТАРИФЫ НА КОММУНАЛЬНЫЕ УСЛУГИ

На 0,8 процента увеличилась квартплата (техобслуживание) и плата за пользование лифтом, на столько же подорожали газ, горячая вода, холодная вода и канализация, вывоз и обезвреживание отходов.

Ставка квартплаты (техобслуживания), единая для всей страны, выросла с 10,85 до 10,94 рубля за квадратный метр общей площади.

С начала года плата за пользование лифтом возросла на 28,8 процента, квартплата (техобслуживание) — на 28,9, плата за пользование радиоточкой — на 32,4, холодная вода и канализация подорожали на 62,4 процента, газ — на 68,8, вывоз отходов — на 80,9, обезвреживание отходов — на 81,5 процента, горячая вода — в 2,26 раза.

БЕЛОРУСЫ НА ВОСЬМОМ МЕСТЕ

По итогам января — августа 2001 года Беларусь заняла восьмое место среди стран СНГ по темпам роста промышленного производства. Об этом свидетельствует информация Статкомитета СНГ.

Лидерами среди стран Содружества по этому показателю за указанный период стали: Украина, где промышленное производство выросло по сравнению с аналогичным периодом 2000 года на 16,9 процента, Таджикистан (15,9 процента), Казахстан (14,1 процента) и Молдова (11,2 процента).

Рост промышленного производства в Кыргызстане за январь — август 2001 года составил 6,3 процента, в Азербайджане — 5,8 процента, в России — 5,3 процента, в Беларуси — 4,3 процента, в Армении — 2,3 процента. В Грузии промышленный спад составил 1,8 процента.

Туркменистан и Узбекистан не предоставили информацию по данному показателю.

БелаПАН

Число наркоманов РАСТЕТ

К концу 2001 года число официально выявленных больных наркоманией в Беларуси составит порядка 7,5 тысячи человек, однако реальное их количество примерно в 12 раз больше.

Об этом на пресс-конференции в Минске сообщил главный нарколог Министерства здравоохранения Владимир Максимчук.

По его словам, наркогенная обстановка в стране продолжает оставаться напряженной. Ежегодно число людей, попадающих в зависимость от наркотиков, а также потребителей наркотических средств возрастает на 15-20 процентов. Рост числа больных наркоманией отмечается во всех регионах страны, но наибольшее их количество зарегистрировано в Гомельской области и Минске. По сравнению с 1996 годом количество выявленных больных наркоманией увеличилось в 2,1 раза. В столице Беларуси, по данным главного врача Минского городского наркологического диспансера Сергея Молочко, сегодня официально на учете состоят 2.215 больных наркоманией. Однако в реальности количество потребителей только инъекционных наркотиков к концу года в Минске может достигнуть 17 тысяч. Это не считая потребителей марихуаны, кокаина и некоторых других неинъекционных наркотиков.

Подавляющее большинство белорусских наркоманов находятся в возрасте до 30 лет, а основной рост числа наркопотребителей начался в 1997 году с активным проникновением героина. И если тогда стоимость одного грамма этого наркотика в Беларуси составляла около 120 долларов США за грамм, то сейчас она колеблется в пределах 20-40 долларов.

Наркотизация населения тесно связана с ростом преступности. По данным Минздрава, за последние десять лет число преступлений, связанных с наркотиками, в стране возросло более чем в 11 раз. Наиболее распространено незаконное изготовление наркотических средств без цели сбыта. Доля этого вида преступления составляет ныне более 70 процентов. Вторым по распространенности преступлением является незаконное изготовление наркотических средств с целью сбыта — доля этого вида преступности в 1993—2000 годах колебалась от 11,5 до 35,4 процента. В последние два года в Беларуси все большее место в числе преступлений наркоманов занимают содержание притонов для изготовления и потребления наркотических веществ, кражи, грабежи и разбои с целью получения денег для приобретения наркотиков.

Алексей ОРЕШКО, Юлия ТЕРЕНТЬЕВА

ПРИШЛА ПОРА ПИСАТЬ ЗАКОНЫ НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

Выступая с речью перед членами Совета Республики Национального собрания Беларуси, председатель палаты Александр Войтович предложил ввести в белорусском парламенте практику принятия законодательных актов на двух государственных языках — белорусском и русском.

Войтович напомнил парламентариям, что в соответствии с Конституцией "государственными языками в Республике Беларусь являются белорусский и русский языки, однако в законотворческой деятельности сложилась практика, когда почти все законодательные акты принимаются только на русском языке". "В других странах мира, где существует двуязычие, законы принимаются сразу на двух государственных языках, — отметил он. — Эту практику пора ввести и нам. Это будет соответствовать Конституции страны, не будет ограничивать права ни белорусско-, ни русскоязычных граждан".

Вячеслав БУДКЕВИЧ

СЕЛО ПАЛИТ СОЛЯРКУ В ДОЛГ

Рекордного показателя достигла в Беларуси задолженность за потребленные нефтепродукты.

По состоянию на конец сентября, общий долг предприятий по нефтеобеспечению за нефтепродукты, отгруженные концерном "Белнефтехим", превысил 34 миллиарда рублей. Одно только Министерство сельского хозяйства и продовольствия задолжало нефтебазам более 20 миллиардов.

Как сообщил БелаПАН источник в правительстве, никогда раньше такой огромной задолженности за нефтепродукты в стране не было. Это, в свою очередь, сказывается на финансово-экономическом положении концерна "Белнефтехим", который не имеет денег для закупки необходимого количества нефти в России. Как считают специалисты, такая ситуация может создать ряд дополнительных проблем с обеспечением народного хозяйства топливом накануне зимы.

Виктория МЕЖИЕВА

ЧТО НАС ЖДЁТ?

В последние годы в Беларуси неуклонно ухудшаются показатели здоровья детей и матерей, а также резко обострилась проблема качественного и количественного воспроизводства населения.

Об этом сообщила доцент кафедры акушерства и гинекологии Белорусского государственного медицинского университета (БГМУ) Людмила Можейко, выступая в Минске на семинаре по проблемам репродуктивного здоровья подростков и молодёжи. По ее словам, в последнее время среди подростков наблюдается рост болезней, передаваемых половым путем. Ежегодно до 10 процентов абортов в стране делается в возрасте от 12 до 17 лет. Все это, несомненно, влияет на репродуктивное здоровье.

Как отметила Можейко, кафедрой акушерства и гинекологии БГМУ были обследованы более двух тысяч девочек-подростков, обучающихся в общеобразовательных и специализированных школах Минска. Результаты указывают на необходимость совершенствования лечебно-диагностических и организационных мероприятий, направленных на раннее выявление патологии в подростковом возрасте и своевременное ее лечение. Так, у 49,7 процента обследованных девочек была выявлена различная экстрагенитальная патология, в структуре которой ведущее место занимали болезни эндокринной системы и систем кровообращения и пищеварения. Гинекологические заболевания были диагностированы у 60,5 процента, и наибольший удельный вес здесь имеют нейроэндокринные синдромы.

На сегодняшний день, как отметила медик, в концепции охраны репродуктивного здоровья особое место отводится проблемам именно подросткового возраста, поскольку в этот период появляются заболевания, которые в дальнейшем могут иметь серьезные последствия для репродуктивного здоровья.

Ольга ОСИПЕНКО

Стажировка в университетах Германии

Немецкая служба академических обменов (ДААД) объявила конкурс для белорусских ученых, лиц, имеющих высшее образование, аспирантов и студентов на соискание стипендий для стажировки в университетах Германии в 2002-2003 учебном году.

Соискание стипендий проводится по девяти программам:

1. Для лиц с высшим образованием не старше 32 лет, занимающихся научной деятельностью (стипендия на срок до 10 месяцев);
2. Для студентов, изучающих германистику, 2-4 курсов (стипендия на 1 семестр);
3. Для студентов, изучающих экономику, 3 курса (стипендия на 10 месяцев);
4. Для студентов 3-4 курсов, лиц с высшим образованием по специальностям, имеющим отношение к Германии (четырехнедельные летние курсы);
5. Для юристов (международное право) не старше 30 лет (стипендия на 10 месяцев);
6. Для ученых и аспирантов не старше 32 лет (стипендия от 1 до 6 месяцев);
7. Для имеющих ученую степень (стипендия от 1 до 6 месяцев);
8. Для студенческих групп до 20 человек (ознакомительная поездка от 7 до 14 дней);
9. Для студенческих групп до 20 человек (учебная практика от 7 до 28 дней).

Бланки заявлений можно получить по адресу: Министерство образования РБ, Минск, ул. Свердлова, 7, комн. 206, тел.: 226 44 84.

Представление всех программ состоится 15 октября в 14.00 в актовом зале Государственного Университета информатики и радиоэлектроники, Минск, ул. П.Бровки, 4, корпус II, станция метро "Академия наук".

ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ

ВОЗЬМУ в аренду на очень выгодных условиях импортный скутер. Тел. 2-36-31.

ПРОДАЮ фотохимию чёрно-белую, просроченную фотобумагу, б/у фотоаппараты "Зенит", "ФЭД", "Любитель-166В", "Ломокомпакт", фотовспышки "Уномат", "ФИЛ". Тел. 2-36-31.

Дорогая подруга
Наташенька ЛАЗАРЬ!
От всей души поздравляем тебя с 25-летием!

Милая, нежная, светлая, чистая,
Пусть в день рожденья твой
Счастье тебе улыбнётся лучистое,
Бед вереница пройдёт стороной.
Пусть никогда, никогда не кончается
Вера твоя в наступленье весны,
Пусть все мечты и надежды сбываются,
Явью становятся сказки и сны...
Счастливой будь, неповторимой,
Всегда люби и будь любимой.
Пускай всегда растут цветы
И праздник будет там, где ты!

Твои подруги: Инна и Света

У Слонімскім аддзеле ЗАГС зарэгістравалі шлюб:

Лагута Іван і Клімко Алена
Палунoсік Дзмітрый і Бень Святлана
Яфімік Сяргей і Саўчык Алена
Балтрушка Віталь і Хілько Алена
Грыцаў Андрэй і Фёдарава Вікторыя
Каваленка Раман і Вяштoрт Наталля
Шарай Юрый і Салейка Аксана
Міско Сяргей і Шэмпель Алена
Шпак Анатоль і Вянградская Таццяна

У Слонімскім аддзеле ЗАГС зарэгістраваны дзеткі, якія нядаўна нарадзіліся:

Сакалоўскі Дзмітрый
Нагавонская Ганна
Дзянісік Аляксандра
Бурак Дар'я
Бурак Наталля
Сарока Артур
Барташ Дзмітрый
Цішко Раман
Ягаўдзік Аляксандр
Аляксейчык Лада
Ёрш Наталля

АФІША

РДК

17 кастрычніка - шоу-праграма **"Тэкіла-любоў"** тэатра моды "Этуаль".
Пачатак у **19.00**

Драмтэатр

14 кастрычніка для дзяцей - **"Кот у ботах"**.
Пачатак у **12.00**

14 кастрычніка для дарослых - **"Чужыя грошы"**.
Пачатак у **18.00**

Стадыён "Дынама"

13 кастрычніка футбол - **"Камунальнік" - "Орша"**.
Пачатак у **16.00**

ВІНШАВАННІ

Дорогая, любимая мамочка
Мария Павловна КРИНЧИК!
От всей души, искренне и сердечно поздравляю тебя с 60-летним юбилеем!
Желаю тебе крепкого здоровья, счастья, удачи, успехов в личной жизни.

Пусть печали в твой дом не заходят,
Пусть болезни пройдут стороной,
Мы весь мир поместили б в ладони
И тебе подарили б одной,
Но и этого было бы мало,
Чтоб воздать за твою доброту.
Мы всю жизнь, наша милая мама,
Пред тобой в неоплатном долгу.
Спасибо, родная, за то, что растила,
За то, что взамен ничего не просила,
Во всём лучшей доли желала ты нам.
Спасибо за всё: за твою доброту,
За труд, за бессонные ночи,
Мы помним об этом,
Мы в вечном долгу,
Родная, любимая наша!

С уважением и любовью твой сын Сергей

Дорогой и любимый
Илья Викторович МАЗАЙЛО!
От всей души поздравляем тебя с днём рождения!

Поздравляем все, любя,
С днём рождения тебя.
Будь таким же энергичным,
Молодым и симпатичным.
И ещё, родной ты наш,
Будь всегда ты рядом с нами.
Желаем в жизни лишь удачи
И достижения мечты.

Крёстная и тётя Лиля

Дорогую, любимую и самую лучшую на свете маму, свекровь и бабушку
Анну Николаевну КИСЛЯК!
Искренне и сердечно поздравляем с юбилеем!

В родных стенах, под этим кровом
Пришли мы вместе пожелать
Тебе отличного здоровья
И никогда не унывать.
Чтоб холод в душу не прокрался,
Чтоб места не было беде,
И чтоб никто не догадался,
Который год идёт тебе.

Сын Дмитрий, невестка Оксана, дочь Оксана с сыном Андреем

Дорогая наша тётя, бабушка и прабабушка
Лидия Ивановна БОСАК!
Поздравляем тебя с днём рождения!

Так хочется в эти минуты
Тебе пожелать навсегда
Здоровья на долгие годы,
А в доме — светла и тепла.
Пусть годы бегут за годами,
О том, что прошло, не грусти,
А тем, кто обидел когда-то,
Обиды всем сердцем прости.
Не трать свои нервы напрасно,
Здоровье не купишь нигде.
Яна ўжо не баялася нічога, толькі б прыціснуцца шчакой да роднага чалавека, толькі б адчуць на сваёй галоўцы такую пяшчотную і ласкавую татаву руку.

Старэйшы сын Коля, што ў суседнім пакоі слухаў магнітафон, таксама падаўся на вуліцу. Ён не мог, як Руслана, бурна праяўляць сваю радасць. Ішоў паволі, сарамяжліва і па-даросламу стрымана

Малюнак Яўгена ІВАНОВА

працягнуў бацьку руку, павітаўся.

А шчаслівая Русланка ўжо трымала ў маленькіх ручках кулёк са спелымі чарэшнямі. Вочкі яе свяціліся шчасцем, нібы гэта былі не звычайныя ягады, а невядома які заморскі пачастунак.

— Мамка, во, тата прынёс! — залепятала яна, убачыўшы, як з ганку спускаецца маці. Твар яе быў злосны, вусны пагрэбліва падціснуты.

— Дзяцей купіць хочаш, вырадак? — як камень, запусціла яна ў мужа цяжкія словы. — Ідзі, і каб больш я цябе не бачыла. Мы разведзены, і больш я табе нічога не вінавата.

— Дзеці мае, і ты не маеш права забараніць мне бачыцца з імі, — няўпэўнена сказаў мужчына, а ў вачах яго едкім дымам слалася туга.

— Алкаголік! — кінула яна самую балючую стралу. — Забірай свае чарэшні!

Вырвала з рук дзяўчынкі кулёк і шпурнула на дарожку. На жоўтым пяску чырвоныя ягады здаваліся крапелькамі крыві...

Малая залементавала, але маці схапіла яе за руку і пацягнула ў хату.

— І ты ідзі! — строга крыкнула сыну.

— Ідзі, сынок, — панура прамовіў бацька. — Як пачнецца новы навучальны год, я да цябе ў школу буду прыходзіць, а да Русланкі — у дзіцячы садок. Убачымся..., — абнадзеіў ён не то сына, не то самога сябе.

Не паспеў выйсці за брамку, як ля дома прытармазіў міліцэйскі УАЗік.

— Што, Рачэўскі, зноў парушаеш спакой сям'і? — не то спытаў, не то пацвердзіў дзябёлы сяржант. — Паехалі, пагутарым.

— Паехалі, — пакорліва згадзіўся мужчына. — Але адкуль вы раптам узяліся?

— Жонка твая былая пазваніла. А мы ж, сам ведаеш, побач знаходзімся, — ужо больш міралюбіва сказаў міліцыянер.

— Але ж я нічога дрэннага не зрабіў..., — няўпэўнена прамовіў Рачэўскі.

— Ну і мы табе нічога дрэннага не зробім. Адвязём далей ад дому і выпусцім. Толькі ты сюды больш старайся не паказвацца. Навошта табе звязвацца з дурной бабай? Будзь жа мужыком.

Сяржант, відаць, канчаткова змяніў гнеў на міласць і гаварыў нават з цеплынёй у голасе.

— Дык жа дзеці у мяне там..., — мужчына схіліў галаву і заціх на сядзенні.

— Ведаю, браток. Але, усё роўна, не хадзі ты сюды. І не пі больш.

— Пастараюся, — няўпэўнена сказаў мужчына, выходзячы з машыны. УАЗік паехаў далей, а ён ішоў па вуліцы, сам не ведаючы куды, і думкі, цяжкія, як жнівеньскія дажджавыя хмары, круціліся ў галаве, абсыпаючы холадам успамінаў...

Калі яны пажаніліся, усе навокал здзіўляліся, як гэта Міця Рачэўскі ўзяў замуж Заборскую Кацьку. Кацька і ў дзеўках была так сабе: не прыгажуня і ў работу не надта ўхапіла. Ды і ў гадах ужо, што там казаць. Але за спіной у багатых бацькоў адчувала сябе ўтульна, як у Бога за пазухай.

Міця хлопец быў удалы. І прыгожы, і вясёлы. На баяне іграў. А сталяр які быў выдатны! Разам з нябожчыкам цесцем яны і пабудавалі гэты дом. Лічы, усю мэблю Міця парабіў сваімі рукамі. І ўсё было б нічога, але аднойчы трапіў ён у аварыю на чыгуначным пераездзе. Як не стараліся ўрачы ўратаваць правую руку, але не ўдалося. І застаўся Міця калекам. На першым часе ён не мог ні спаць, ні есці. Ажно схуднеў — так перажываў за сваё калецтва. А яшчэ за тое, што Кацька раптам стала нібы чужая. У светлых шэрых вачах не раставалі халодныя ільдзінкі.

Міця запіў. Страшна, па-чорнаму. А п'яны маўчаў і плакаў. Жонка падала на развод. Пасля доўгай судовай канцеліі іх развялі. Ён і не патрабаваў, але Кацька, "каб было ўсё па-справядлівасці", сплаціла яму за частку дома, тым самым паставіўшы крыж на былых адносінах. Яна ўсё ніяк не магла зразумець аднаго: чаму да Міці так хіляцца дзеці. Бывае, сустрэнуць на вуліцы п'янага і аброслага — здалёк бягуць, лашчацца. А ён, як знарок, яшчэ і сюды ходзіць, зманьвае іх. Пасля такіх сустрэч Русланка плача, адмаўляецца ад ежы, а Коля робіцца ўпартым і грубым.

... Толькі выйшаўшы за пасёлак, ён зразумеў, што ідзе зусім у другі бок, што родная вёска з пустою бацькоўскай хатай, якая прытулілa і абагрэла яго адзінoту, знаходзіцца далёка. Раптам пайшоў дождж. Мокры да ніткі, з пустым рукавом пінжака, што матляўся, як перабітае крыло вялікай птушкі, павярнуў назад. Вадзіцелі сустрэчных машын, праехаўшы фарамі ўжо даволі густы змрок, бачылі, як ён выціраў са стомленага спакутаванага твару ні то дажджынкі, ні то слёзы...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Газета Слонімская
11 — 17 кастрычніка 2001г. №41 (227)

ПАЭЗІЯ

Янка КАРПОВІЧ

Малітва

Край ад варожасці, звады,
Пошасці, гвалту і здрады,
Божа! Навек заслані!
Родную, матчыну мову,

Спадчыны нашай аснову,
Божа! Заўжды барані!
Божа! Вярні нам наноў
Веру, надзею, любоў.

Балюча на сэрцы

Жыццё ў паняверцы —
Пакуты на сэрцы.
Мана на паперцы —

Самотна на сэрцы.
Чарнобыль на сэрцы —
Балюча да смерці.

Мае вершы

Цяжкім жыццём
і горам збіты,
І многімі зусім забыты,
Чытаю вершы як малітву,
Нясу свой крыж
па лязе брытвы.

Я клічу іх —
свой паратунак —
У іх мой лёс
і мой прытулак,
Маё жыццё, мая замова,
Мая надзея і выснова.

Станислав БУХНАЦЕВИЧ

Одинокая кукушка

Одинокая кукушка,
Сирота лесная
Ищет собственных детишек,
Голос надрывая.

Ей насмешливое эхо
Отвечает: "Ку-ку!"
Но никак не помогает
Позабыть разлуку.

Она вольная, как ветер,
Но, помимо воли,
У неё нет материнства,
Нет хорошей доли.

А сова, в дупле зевая,
На кукушку злится,
Потому что в это время
Совам сладко спится.

Год за годом пролетают,
Старость к ней крадётся.
И она, утратив зоркость,
Просто разобьётся.

Чёрный ворон её телом
Вдоволь насладится,
И сова в дупле уютном
Перестанет злиться.

Весть печальную об этом
Разнесёт сорока.
От себя в конце добавит:
"Я не одинока!".



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Людмила РЯБЧЕНКО

Любимому

Прошу тебя лишь об одном:
Не забывай меня, любимый!
Мой первый взгляд
и поцелуй
Не забывай, любимый!
Не забывай мои глаза,
Улыбку, смех и радость,
Пусть принесут они тебе
Лишь только
в жизни радость.
Не забывай и поцелуй,
С которым я прощалась.
Поверь ты мне,
с таким, как ты,
Я больше не встречалась.

Виктор ГОРБАЧЁВ

Зачем?

Зачем нам обида,
Зачем нам разлука?
Ведь жить не сможем
Мы друг без друга.
Зачем униженья,
Зачем оскорбленья?
Ведь жизни летят
Незаметно мгновенья.
Зачем нам прощанья,
Зачем расставанья,
Если при встрече
Не будет желанья?
Зачем эти ночи,
Зачем эти дни,
Если не вместе,
Прожиты они.

Елена АПАНАСИК

Я зажигаю тихо свечи

***

Вьюга закружит
В танце пургой —
Ты мне так нужен,
Мой дорогой!

Нужен, как воздух
И как вода,
Нужен, как солнце
И в небе звезда.

Вьюга закружит
В танце пургой —
Ну почему же
Ты не со мной?

***

Я зажигаю тихо свечи
И в одиночестве мечтаю.
Я вспоминаю зимний вечер,
Последний, дареный судьбою,
Минутный крик
и сердца стук.
И кажется, опять с тобою
Я пью вино из тех же рук.
Ты шепчешь ласково
и нежно
О том, что любишь
и скучаешь
И так, как это
было прежде,
Со мною голову теряешь...
Я у окна стою и плачу.
Я потеряла свой покой...
Спасибо, всё же, за удачу,
За те минуты, мой родной!

ПАМЯЦЬ

"СВАЮ ЛЮБОЎ ДА РОДНАЙ МОВЫ ЗАЎЖДЫ Ў СЭРЦЫ Я НАСІЎ"

Успаміны пра паэта Алеся Сучка з нагоды 85-х угодкаў з дня нараджэння

Яго не стала раптоўна, хоць нічым не хварэў і не скардзіўся на здароўе. Жыць бы яму ды жыць...

У той дзень, 27 жніўня 1993 года, калі Пятро Дабрыян (літаратурны псеўданім Алесь Сучок) ляжаў на аперацыйным стале ў Слонімскай бальніцы, пасля таго, як упаў і стукнуўся галавой, пра яго ўпершыню паказвалі перадачу, якую зняў Юрка Голуб на Гродзенскім тэлебачанні.

Цудоўная перадача, шчырая і светлая, якім быў і сам Пятро Навумавіч. Ён паспеў папярэдзіць усіх сваіх сваякоў, сяброў, аднавяскоўцаў аб тым, што будуць яго паказваць па тэлевізары. Але больш за ўсё чакаў гэтай перадачы ён сам. Чакаў, але, на жаль, так і не ўбачыў сябе на тэлеэкране. У той жа дзень паэта Алеся Сучка з вёскі Азярніца Слонімскага раёна не стала.

Апусцела, асірацела хата ў роднай вёсцы, дзе шмат гадоў жыў гэты энергічны, рухавы, вясёлы і добры чалавек. Пры жыцці паэт меў вялікую гаспадарку, трымаў кароўку, парсючка, курэй, даглядаў агарод, сад і пасеку. Больш за ўсё Пятро Навумавіч любіў частаваць людзей мёдам... Цяпер у гэтым доме іншыя людзі жывуць.

Нарадзіўся Пятро Дабрыян 7 кастрычніка 1916 года ў бежанстве. А калі бацькі вярнуліся дамоў, паступіў у першы клас польскай школы ў вёсцы Мяльканавічы. Вясной 1932 года ён уступіў у нелегальную піянерскую арганізацыю. У жніўні 1933 года Дабрыяна Пятра выбралі сакратаром Слонімскага падпольнага райкама піянераў.

Аднойчы пасля вечарынкі ў вёсцы Мяльканавічы Пятро Дабрыян папрасіў сваіх юных сяброў застацца ў хаце.

— Нам патрэбна навучанне на беларускай мове, — казаў Пятро. — Трэба падрыхтаваць забастоўку вучняў, каб адкрыць такую школу.

Юныя падпольшчыкі горача ўзяліся за справу. За некалькі тыдняў размножылі на шапірографе больш за дзвесце пракламацый. А ў сярэдзіне студзеня 1934 года дзеці прыйшлі ў школу і заявілі дырэктару Вішнеўскаму, што жадаюць вучыцца на роднай мове. Для Вішнеўскага гэта быў гром сярод яснага неба. Ачомаўшыся ад нечаканасці, ён са злосцю кінуў:

— Ніколі гэтага не будзе!

Тады школьнікі выйшлі на вуліцу і разгарнулі транспарант са словамі: "Патрабуем школы на роднай мове!" Дзвесце вучняў прайшлі па вуліцах Мяльканавіч, раскідваючы лістоўкі з такім жа зместам.

Праз некаторы час Пятра Дабрыяна арыштавала паліцыя, а ў верасні 1935 года польскі акруговы суд прысудзіў яго да чатырох гадоў турэмнага зняволення...

Вершы наш зямляк пачаў пісаць, як ён сам успамінаў, "яшчэ будучы ў слонімскай турме. Паперы і алоўка мець у камеры адміністрацыя не дазваляла. Але я ўхітрыўся... Пісаў алюміневай лыжкай на сцяне...". Калі выйшаў Пятро Дабрыян на волю, пачыху адсылаў вершы ў Вільню. Каб схавацца ад пераследу, падпісваўся псеўданімам Алесь Сучок.

У 1938 годзе віленскі часопіс "Шлях моладзі" ўпершыню змясціў яго верш "Я бачыў":

Я бачыў — усходзіла сонца,
З-за горкі зіхцела яно.
І яснае, пекна бясконца
Свяціла й свяціла ў акно.
І песцілі душу праменні,
У сэрца мне сілы лілі,
У думках ўставалі
імкненні —
За сонцам плылі і плылі...

Праз год той жа часопіс "Шлях моладзі" друкуе новыя вершы Алеся Сучка "Зіма", "Мне ахвота", "Вясна, вясна, прыйдзі хутчэй". У простай і нязмушанай форме, выкарыстоўваючы традыцыйныя вобразы вясны, сонца, вольнай птушкі, паэт услаўляе свабоду. Сучок пісаў пра жыццё сялянскага хлопца-бунтара, які сядзіць у турме. Герой твораў вясковага паэта быў моцны і рашучы чалавек, які верыў у сілы народа:

Мы здабудзем перамогу,
Бо за намі ўвесь народ.
Падымайма ўжо трывогу,
Смела пойдзем у паход.

Сёння вершы Алеся Сучка, напісаныя ў трыццатыя гады, маюць, перш за ўсё, літаратурнагістарычную цікавасць. Гэта, найперш, вершы-заклікі, вершы-лозунгі. Паэт-змагар вучыўся майстэрству ў Валянціна Таўлая, Міхася Васілька, Максіма Танка і ў іншых паэтаў Заходняй Беларусі. Уладзімір Калеснік у кнізе "Сцягі і паходні" (Мн., 1965г.) адзначаў, што "мастацкая вартасць неяк паблякла ў смузе часу, але для гісторыі літаратуры такія рэчы, як, напрыклад, вершы Алеся Сучка, маюць сваё значэнне, іх нельга выкінуць, як слова з песні".

Пятро Дабрыян быў вельмі актыўным чалавекам. Ён паспяваў усюды: на пасяджэнне раённага літаб'яднання, на сустрэчы з вучнямі і настаўнікамі, да сяброў у госці, адгукнуцца на радасць і дапамагчы ў бядзе. Ён прымаў актыўны ўдзел у рабоце Слонімскага раённага хору ветэранаў вайны і працы. Спяваў "Зорку Венеру" Максіма Багдановіча, "Цячэ ды стогне Днепр шырокі", беларускія і рускія народныя песні. Ён умеў чытаць свае вершы і рабіў гэта як сапраўдны артыст. Ён жыў паэзіяй, у вершах была яго біяграфія, яго хваляванні, яго радасць і трывога:

Прайшоў я з мовай
праз пакуты,
Праз дзікі здзек
былых паноў.
Не раз кайданамі
быў скуты,
Не раз цярпеў боль бізуноў.
Але ад мовы не адрокся:
Я з ёю сеяў і касіў...
Сваю любоў да роднай мовы
Заўжды ў сэрцы я насіў.

Алесь Сучок ніколі не меціў у вялікія паэты і не думаў пра гэта. Жывучы ў весцы, ён дасылаў свае творы ў рэспубліканскія часопісы і газеты. Лепшыя з іх з'яўляліся на старонках літаратурных выданняў, але ўласнага зборніка паэт так і не дачакаўся. Падборкі вершаў Алеся Сучка былі надрукаваныя ў калектыўных зборніках "Сцягі і паходні" (1965), "Ростані волі" (1990), "Золак над Шчарай" (1994) і іншых. Яго бясхітрасныя радкі напоўнены шчырасцю, адкрытасцю і даверам:

Як жаўрука пачую спеў,
У захапленні стану:
Так прывітацца б
з ім хацеў —
Рукою не дастану.

...Калі мне бывала сумна і надакучала гарадская мітусня, я ехаў у Азярніцу да Алеся Сучка. Ён радаваўся сустрэчам, любіў людзей, любіў жыць. Такім мне Пётр Навумавіч і запомніўся.

Сяргей ЧЫГРЫН

Слонімскія пісьменнікі Аляксей Якімовіч, Анатоль Іверс і Алесь Сучок у гасцях у вучняў, 80-я гады

ПЕРШАЯ ЛІГА

УСЁ ВЫРАШЫЛАСЯ Ў ДАДАДЗЕНЫ ЧАС

"Дарыда" (Мінскі раён) — "Камунальнік", 0 – 1

7 кастрычніка. 500 гледачоў.
Суддзя: Канстанцін Дайлід (Брэст).
"Камунальнік": Бекіш, Капельян, Кірыленка, Горбач, В.Дзегіль, Цішчанка, Вярбіцкі, Варанцоў (Грынюк), А.Дзегіль (Верэшня), Астапчык (Шэпятоўскі), Місюк.
Галы: Андрэй Місюк, 90.

У чаканні нясумнага футболу

Магчыма і цяжка ў гэта паверыць але "Камунальнік" выйграў на выездзе ў "Дарыды", якая яшчэ не страціла шанцаў на выхад у вышэйшую лігу. І па словах трэнера слонімцаў Валянціна Гароднікава, гульня гэтая была прыгожая.

Першыя 15-20 хвілін гасцям прыйшлося цяжка, але "Камунальнік" здолеў выстаяць. Больш таго, у далейшым слонімцы выглядалі на полі, калі не лепш за гаспадароў, то на роўных — безумоўна. У цэнтры добра адпрацавалі Цішчанка і Астапчык. Надзейна ў абароне адыгралі Капельян з Бекішам, а наперадзе не давалі спакою абаронцам гаспадароў Вярбіцкі і Місюк. Дарэчы, апошні і забіў пераможны гол у вароты "Дарыды".

Здарылася гэта ўжо ў дабаўлены арбітрам час. Вытрымаўшы апошнюю атаку гаспадароў, слонімцы рашуча пайшлі наперад. Шэпятоўскі, які выйшаў на замену, з флангу накіраваў мяч у штрафную саперніка. А ўжо там па-гаспадарску разабраўся Андрэй Місюк і запісаў на свой рахунак другі гол у складзе "Камунальніка".

— Гульня атрымалася, — адзначыў Валянцін Гароднікаў. — Слонімская каманда здолела праявіць характар, волю да перамогі. Увогуле, у гэтым матчы мы мелі больш магчымасцей забіць гол. Па небяспечным момантам расклад прыкладна 3-10 на карысць "Камунальніка".

Гэтая перамога дазваляе слонімцам больш спакойна завяршыць сезон, бо астатнія матчы будуць з роўнымі па сілах сапернікамі. І згуляць з імі можна і трэба вынікова і прыгожа.

Наступны матч наша каманда праводзіць у Слоніме. У суботу, 13 кастрычніка, у госці да нас прыязджаюць футбалісты "Оршы". Пачатак гульні — у 16 гадзін на стадыёне "Дынама".

Валерый КАВАЛЕНКА

ТУРНІРНАЯ ТАБЛІЦА ПАСЛЯ 26-га ТУРА

		гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1.	Тарпеда	24	18	3	3	57	45-11
2.	Зорка-ВА-БДУ	24	16	5	3	53	62-18
3.	Хімік	25	15	6	4	51	51-20
4.	Дарыда	24	15	4	5	49	37-18
5.	Тарпеда-Кадзіна	25	13	3	9	42	27-24
6.	Граніт	24	12	4	8	40	43-21
7.	Ліда	25	9	7	9	37	26-26
8.	Свіслач	24	9	4	11	31	32-42
9.	ЗЛіН	25	7	8	10	29	28-32
10.	Керамік	24	7	6	11	27	26-33
11.	Орша	24	8	1	15	25	35-60
12.	Камунальнік	24	6	5	13	23	21-40
13.	Дынама-Юні	24	5	6	13	21	17-35
14.	Рагачоў-ДЮСШ-1	24	2	8	14	14	20-55
15.	Нёман	24	3	4	17	13	16-51

ЧЭМПІЯНАТ ВОБЛАСЦІ

"ЧОРТАЎ ТУЗІН" У НАВАГРУДСКІХ ВАРОТАХ

"Навагрудак" — "Камунальнік-2", 2 – 13

Аўтар аднаго з хет-трыкаў Міхаіл Верэшня

Навагрудак. 3 кастрычніка.
Суддзя: Клепча (Ліда).
Камунальнік-2: Гайдзецкі, Горбач, Боцік, Скляр, Астапчык, Яўсеенка, Верэшня, Шэпятоўскі, Ясінскі, Майсейчык, Варанцоў.
Галы: Астапчык, Яўсеенка, Верэшня (па тры галы); Шэпятоўскі, Ясінскі (па два галы).

На чэмпіянаце Гродзенскай вобласці па футболу ў мінулую сераду слонімскі футбольны клуб "Камунальнік-2" устанавіў рэкорд. У Навагрудку наша каманда разграміла мясцовых футбалістаў. Галкіпер гаспадароў трынаццаць разоў даставаў мяч са сваіх варот. Тры хет-трыка за адну гульню — таксама рэкорд. У чэрвені навагрудская каманда на сваім полі выйграла ў слонімцаў з лікам 1:0. Цяпер вось перамагчы не ўдалося. Ігра футбалістаў "Камунальніка-2" была прыгожай, і лік гаворыць сам за сябе.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДА АПОШНЯЙ ГУЛЬНІ – НАДЗЕЯ

Трэнер мастоўскіх футбалістаў Уладзімір Бадун лічыць, што каманда "Нёман", якую ён узначальвае, мае шанц у наступным годзе гуляць у першай лізе. І гэтая праблема будзе вырашана ў апошніх сустрэчах, нягледзячы на тое, што два апошнія матчы былі прайграны.

Перанесеная з-за хваробы мастачан сустрэча са "ЗЛіНам" адбылася ў мінулую сераду ў Гомелі. Гаспадары поля забілі пераможны мяч толькі ў дадатковыя пяць хвілін. У нядзелю ж мастаўчане гасцявалі ў Мікашэвічах. На першых хвілінах сустрэчы пасля правалу ў абароне гасцей футбалісты "Граніту" адкрылі лік сустрэчы. На васьмідзесятай хвіліне матчу Уладзімір Кухлей выраўнівае лік. А на дзевяностай хвіліне гаспадары поля забіваюць гол і дабіваюцца важкай для сябе перамогі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Вынікі астатніх матчаў 26-га тура:

Свіслач — Орша, 4-2
Граніт — Нёман, 2-1
Тарпеда-Кадзіна, Рагачоў, 1-0
Хімік — Тарпеда, 0-0
Ліда — Керамік, 1-1
ЗЛіН — Дынама-Юні, 0-0

Перанесены матч 22-га тура:

ЗЛіН — Нёман, 1-0

КОМАНДА ПРИЗЕРОВ

Недавно в Гродно прошел открытый чемпионат областного центра по легкой атлетике на призы Гродненского облисполкома. Кроме команд десяти городов Беларуси на соревнования получили приглашения и легкоатлеты Польши, России и Литвы.

К сожалению, из-за границы приехать смогли только спортсмены из Калининграда. Тем не менее турнир удался, и команда специализированной ДЮСШ Слонимского района выступила на нем выше всяких похвал. Из восьми человек в нашей команде только Таня Жуковская (Жировичская СШ) не смогла войти в призеры. Но и она была в пятерке лучших в своих дисциплинах. Третьими стали Андрей Коротько (Селявичская СШ) и Андрей Лагутик (Новоселковская СШ) в беге на 1 500 м в своих возрастных группах, Александр Пигульский (Новоселковская СШ) в толкании ядра и Кирилл Покало (Новодевятковичская СШ) в метании диска. Он же в толкании ядра был вторым, — так же, как и Татьяна Тимофейчик (Жировичская СШ) в метании молота. Ну, а бесспорными лидерами стали Марина Сучко (Шиловичская СШ) в ходьбе на 3 000 м и Ирина Искрик (Поречьевская СШ) в прыжках в длину и беге на 100 м с барьерами.

Командного первенства на турнире не проводилось, но успех команды Слонимского района был настолько очевиден, что наши ребята получили приглашение на участие в подобном турнире в конце ноября в Калининграде. Тренеры команды Вера Гурская, Сергей Демидик, Дмитрий Близнюк и Валерий Черехович надеются на достойное выступление своих воспитанников и в России. А с организацией поездки проблем возникнуть не должно — помощь в этом всегда, по возможности, оказывает руководство отдела спорта и туризма Слонимского райисполкома.

Валерий КОВАЛЕНКО

ОТБОРОЧНЫЙ ТУРНИР НЕ УДАЛСЯ

Национальная сборная Беларуси по футболу не сумела выйти в "плей-офф" отборочного турнира чемпионата мира 2002 года.

6 октября в заключительном матче групповых соревнований она проиграла в Кардиффе команде Уэльса со счетом 0:1 (на 47-й минуте мяч забил 26-летний нападающий шотландского "Селтика" Джон Хартсон после прострела полузащитника английского "Тоттенхэма" Саймона Дэвиса) и осталась на третьей позиции в 5-й европейской отборочной группе. В случае победы белорусы могли занять второе место и продолжить борьбу за путевку в финал, поскольку основной их соперник — сборная Украины — сыграла в гостях вничью со сборной Польши (1:1). Однако на протяжении всей встречи подопечные Эдуарда Малофеева имели считанные возможности для взятия ворот валлийской команды.

Итоговое положение команд: Польша — 21 очко, Украина — 17, Беларусь — 15, Норвегия — 10, Уэльс — 9, Армения — 5. Сборная Польши напрямую вышла в финал чемпионата мира (это произошло за два тура до финиша), а сборная Украины в "плей-офф" дважды встретится с командой Германии, занявшей второе место в 9-й группе.

В 10 отборочных матчах ЧМ-2002 сборной Беларуси одержала 4 победы (дома над Уэльсом, Арменией и Норвегией с одинаковым счетом 2:1 и над Польшей 4:1), 3 раза сыграла вничью (в гостях с Украиной и Арменией 0:0, Норвегией 1:1) и потерпела 3 поражения (дома от Украины 0:2, в гостях от Польши 1:3 и Уэльса 0:1), разница забитых и пропущенных мячей 12—11. Мячи на счету Романа Василюка (5), Александра Хацкевича (3), Валентина Белькевича и Николая Рындюка (по 2).

Дмитрий ВЛАСОВ

У "ТАЛАНТА" – ПЕРВЫЙ ЮБИЛЕЙ

В конце прошлого месяца детско-юношескому футбольному клубу "Талант" исполнилось 5 лет. В честь этого небольшого, но все-таки юбилея был организован праздник — футбол и шашлыки после него для всех участников.

На футбольном поле встретились первые выпускники клуба и нынешняя старшая группа 1985-86 г.р. Уже на 4-й минуте Денис Куршаков вывел выпускников вперед, на что "младшие" ответили комбинационной, грамотной и результативной игрой. Сначала Дмитрий Зубко сравнивает счет, а увеличить его удается Андрею Молчанову и Дмитрию Захожевскому — 3:1. Сокращает разрыв в счете Александр Сычев, но последнее слово все же осталось за "младшими". Дмитрий Зубко, сменив в этой игре свое амплуа защитника на нападающего, сыграл эффектно, перебросив мяч над вышедшим из своих ворот Сергеем Бергом. Итог — 4:2 в пользу команды выпускников.

Затем обе команды проверили себя в пробитии пенальти. Здесь реваншировали "старики" — 7:5. Голы, как в матче, так и в серии пенальти были на загляденье. Зрители же не пожалели, что пришли на праздник и увидели зрелый футбол.

Сейчас "Талант" объединился с ФК "Мария". Название новому клубу выбрали сами ребята — "Атака", как символ стремления вперед. А все начиналось в 1996 году на базе СШ №3. Работа велась на средства, выделяемые ЖЭС по месту жительства. За это время воспитанники "Таланта" выступили в 76 соревнованиях — от городских до республиканских — в которых 34 раза были победителями, 11 раз завоевали вторые места и еще 19 раз становились третьими. Все эти пять лет у руля "Таланта" стоял тренер Руслан Корнев.

Что касается воспитанников, то многие из них прекрасно зарекомендовали себя и продолжают совершенствовать свое мастерство. Это Денис Куцко (выступает во 2-й лиге за ФК "Барановичи"), Александр Ботик и Сергей Скляр (ФК "Коммунальник"). Остальные ребята сейчас учатся, но и им поступают предложения из разных команд мастеров.

Сегодняшние воспитанники Руслана Корнева, ребята 1985-86 г.р., готовятся к международному турниру, который пройдет в ноябре в Речице. Большие надежды тренер связывает с Николаем Добрияном, Александром Деколой, Дмитрием Захожевским, Андреем Молчановым, Виталием Рудько, Дмитрием Зубко. Пожелаем и мы играть ребятам в "большой" футбол. Все предпосылки к этому у них есть, и в следующем году команда планирует заявиться юным составом на чемпионат области среди взрослых.

Юлия ТЕРЕНТЬЕВА

прогноз погоды



предоставлено сайтом www.meteo.by

НА 10-17 ОКТЯБРЯ

Дата	10	10	11	11
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	11	12	11	13
скорость ветра, m/sec	5	5	5	4
Дата	12	12	13	13
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	8	10	9	9
скорость ветра, m/sec	4	7	7	6
Дата	14	14	15	15
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	10	10	12	14
скорость ветра, m/sec	4	4	3	3
Дата	16	16	17	17
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	5	8	12	14
скорость ветра, m/sec	1	1	1	2

СУПЕРКРОССВОРД

составила Янина Кисляк

По горизонтали:

3. Что девичье исчезает в загсе? **9.** Самая популярная в мире после войны песня. **12.** Украинское Габрово. **13.** Казанская, но не сирота. **14.** Инопланетная посуда. **15.** Краткий вывод из сказанного. **16.** Древесная лягушка. **19.** Недуг, который одолел Бетховена. **20.** Какая объективная реальность размножается спорами? **23.** Тропическое растение с крепким полым стеблем, которое цветёт раз в жизни и после плодоношения погибает. **24.** Об этом цветке сам пророк Мухаммед сказал так: "У кого два хлеба, пусть продаст один, чтобы купить этот цветок, ибо хлеб – пища тела, а он – пища души". **25.** Растолковывать не буду: может, гну, а может, куду. **29.** Шашлык "по-азербайджански". **30.** Что у нас кладут зимой, чтобы ремонтировать летом? **34.** Стакан с точки зрения геометрии. **38.** Французский шансонье, которого вывела в люди Эдит Пиаф. **39.** Сообщение о выполнении взятых на себя обязательств. **42.** Последняя опера П. Чайковского. **43.** Что будит человека, уснувшего под страшный грохот? **44.** Играя в него, французский король Людовик X простудился и умер. **47.** Знаменитый детектив в помятом плаще из телесериала. **48.** Склад живого тела. **51.** Половина спасения. **54.** Овощ, которого не рекомендовал Корейко есть на ночь Остап Бендер. **56.** Волк ему не товарищ. **58.** Высокогорный казак. **59.** Сотрудник редакции, всё время делающий работу над чужими ошибками. **60.** Уже в начале V века они имели свою письменность. **63.** Как звали собаку Одиссея? **64.** Город, в котором сошлись "сыновья лейтенанта Шмидта". **70.** Для него смерти подобно хоть на йоту отступить от правил и моды "высшего света". **72.** Что никак не могут сочинить к белорусскому гимну? **73.** "Бездонная бочка". **74.** Место, куда уходит продавец в рабочее время. **75.** Мужчина, который просто стелется перед женщинами. **76.** Что боятся потерять японцы? **77.** Воин личной охраны хана. **78.** Что нужно съедать ежедневно, как считают англичане, чтобы до смерти не обращаться к врачу? **79.** Могущественная конечность, которую подмазывают деньгами. **80.** Там хранятся наши фотографии.

По вертикали:

1. Этот сумеет обнять! **2**. Пушной побор на Руси за здорово живёшь. **3**. Символ, от которого следует отказаться невесте, если она "немножко беременна". **4**. Тихий немецкий пьяница, ставший причиной громких потрясений в России. **5**. Рассказ А.Куприна о циркачах. **6**. Кривой меч, делающий "секирбашка". **7**. Еда, в которой свиньи понимают толк. **8**. Обычно оно чередуется с речитативом. **9**. Главный враг Буратино. **10**. Малограмотная представительница аборигенов. **11**. Головомойка, но не взбучка. **16**. Сказочный счастливчик. **17**. Штурмовая работа "за так". **18**. За нас – разведчик, против нас – ... **20**. Пламенное начало. **21**. Вспомогательное устройство для глухих на стадионе. **22**. Колокольная тревога. **26**. Казахский рублик. **27**. Какой стране в качестве символа подошёл кедр? **28**. "Председатель жюри первого конкурса красоты". **31**. Первый среди семи античных мудрецов. Он считал, что легче всего переносить несчастья, когда видишь своих врагов в ещё худшем положении. **32**. Наполовину чуваш, наполовину еврей (по В.Астафьеву). **33**. Что не сеяно родится? **35**. Крылатая фраза из кинокомедии "Бриллиантовая рука": "Если человек – ... , то это ненадолго". **36**. Её прописывают негодникам. **37**. Я получаю, ты получаешь, он получает... А что же происходит? **40**. Её пускают в глаза, когда хотят произвести хорошее впечатление. **41**. Американский Илья Муромец. **44**. Суша под водой и вода под сушей. **45**. Гостинично-цирковая единица. **46**. Страна, где нельзя продать ни одной банки говяжьей тушёнки. **48**. Документ, открывающий дверь отдельной квартиры или камеры. **49**. Объявление о сборище за деньги. **50**. Какого шампанского вроде как 17 бутылок выпил на ярмарке гоголевский Ноздрёв? **51**. Их втирают, чтобы ввести в заблуждение. **52**. Чувство, неведомое безбожникам и пессимистам. **53**. Когда кое-как, то с ним пополам. **55**. Горькая жалоба. **56**. Инки считали это животное обжорой, отъедающей от Луны каждую ночь по кусочку. **57**. Для трудяги – премия, для лодыря – подзатыльник. **60**. Азиатская столица, которую недавно посетил Папа Римский. **61**. Американский космонавт Бейкер как представитель фауны. **62**. Женская форма расчёта. **65**. Нагрудный знак отличия женщины от мужчины. **66**. Последний танец М.Брандо в Париже. **67**. Древнеримский бог, специалист по пьяному делу. **68**. "Летательный аппарат" панночки из гоголевского "Вия". **69**. Корабль, на котором Ясон отправился за "золотым руном". **70**. Пищевой продукт, состоящий практически из сплошного холестерина. **71**. Христианский символ паствы.

ГОРОСКОП
от WWW.IGNIO.COM
НА НЕДЕЛЮ

ОВЕН

Вам необходимо быть мудрым и терпеливым для того, чтобы не упустить капризную удачу. У Вас появится шанс продвинуться по карьерной лестнице. В понедельник лучше поберечь хорошие отношения и не провоцировать конфликтные ситуации с начальством. Вторник окажется достаточно конструктивным днем, когда Вы сможете поделиться своими идеями и замыслами, а к Вам прислушаются и помогут воплотить их в жизнь. В среду можете, при необходимости, рассчитывать на помощь друзей. В четверг Вас может порадовать новая интересная информация, позволяющая расширить Ваши возможности, постарайтесь не пропустить ничего важного.

ТЕЛЕЦ

В начале недели постарайтесь не подпускать к себе внезапно нахлынувшую тоску и уныние, они быстро развеются, т.к. события, происходящие с Вами, будут весьма позитивны. В понедельник обратитесь с просьбой к начальству, и, если она не окажется сверхфантастической, то непременно будет исполнена. Во вторник события порадуют Вас, и от тоскливого настроения не останется и следа. В четверг удачны поездки и командировки. Этот день хорош для разрушения старого и создания нового. В пятницу пройдут весьма успешно судебные дела.

БЛИЗНЕЦЫ

На этой неделе Вам удастся проявить такое качество как трудолюбие. Проявляя лучшие качества Вашей личности, помогая окружающим, Вы увидите, как возрастет Ваш авторитет, и люди потянутся к Вам. В понедельник у Вас есть шанс успеть многое сделать и доделать, и почувствовать удовлетворение от проделанной работы. Во вторник порадуют долгожданные новости, связанные с ближайшим будущим. В этот день удачны поездки и командировки. Пятница может порадовать новыми перспективными предложениями. В выходные загляните на чашку чая к друзьям или родственникам.

РАК

С одной стороны, Вам захочется чувствовать себя личностью независимой, а с другой, возрастет желание ощущать себя человеком нужным, без которого кто-то и дня не сможет прожить. Не мучайтесь, в понедельник у Вас получится совместить эти стремления. В понедельник все будет прекрасно, если Вы не будет спорить с начальством. Во вторник и среду есть возможность с легкостью разрешить волнующие Вас проблемы. В четверг Вы сможете опереться на необходимую помощь друзей.

ЛЕВ

Ваше добросовестное отношение к работе начинает приносить ощутимые плоды. Результаты напрямую будут зависеть от вложенных сил и творчества. Вы будете заниматься решением не только своих проблем, но и проблем окружающих. Отношения с родственниками станут более гармоничными. Постигайте смысл бытия или просто накапливайте знания. Во вторник, по возможности, отдохните на природе. В среду необходимая помощь друзей Вам обеспечена.

ДЕВА

У Вас может появиться долгожданная возможность воплотить в реальную жизнь давние планы и замыслы. Необходимо проявлять особое внимание при подписании каких-либо бумаг и документов. Учитесь не только добросовестно работать, но и полноценно отдыхать. В среду не стесняйтесь проявлять активность и решительность применять свои организаторские способности на практике. Во второй половине дня загляните к друзьям на чашечку чая. В четверг будут благоприятны поездки и командировки.

ВЕСЫ

Вас ожидает довольно насыщенная неделя, полная разнообразными событиями, возможны внезапные взлеты, но необходимо поберечь себя и от подводных камней. Ситуация на работе изменится к лучшему, только не перестарайтесь с экстравагантностью. В понедельник Вы можете опереться на своевременную помощь друзей. Придя домой, наведите порядок и избавьте свой дом от накопившегося хлама. Во вторник будут удачны поездки, командировки и начало путешествий. В среду лучше не планировать ничего серьезного, а позволить себе небольшой отдых.

СКОРПИОН

Вы решительны, полны сил и оптимизма, и, что радует, совсем не склонны к меланхолии. Раскрывайте свой творческий потенциал, применяйте свое мастерство на практике. На этой неделе Вам удастся завершить начатые дела и почувствовать долгожданное облегчение. В понедельник конструктивные события позволят Вам расширить сферу Вашей деятельности. Блестящие идеи в среду могут произвести впечатление не только на коллег по работе, но и на друзей и родственников. В четверг будут удачными поездки и командировки, больше доверяйте своей интуиции.

СТРЕЛЕЦ

Побольше уверенности в собственных силах, и, что очень важно, сохраняйте эмоциональное равновесие. Постарайтесь проявить должное терпение и не торопите происходящие события, чтобы не наломать дров. Могут появиться мысли о смене работы, но не спешите с окончательным решением. Придется работать не покладая рук. Лучше ничего серьезного на этот день не планировать. Среда порадует Вас интересными новостями и конструктивными предложениями. В четверг обсудите с друзьями возникшую проблему, они помогут Вам.

КОЗЕРОГ

Неделя достаточно пестрая и даже напряженная в эмоциональном плане. Однако это не станет помехой для проявления Вашей виртуозности и профессионализма. А вот с собственным упрямством придется побороться. Постарайтесь сохранять хорошие отношения с начальством, т.к. от него может зависеть решение сразу нескольких Ваших проблем. Во вторник, если Вы не согласны с мнением коллег по работе, сделайте над собой усилие, оставьте свое мнение при себе, ведь все еще неоднократно поменяется. В среду будут удачными встречи, поездки, командировки. Общаясь с коллегами по работе в четверг, контролируйте свою речь.

ВОДОЛЕЙ

Вам необходимо сконцентрироваться на самом главном и не распыляться по мелочам. Поделитесь своими накопленными знаниями, и Вы не пожалеете об этом. В понедельник целеустремленность плюс незначительная помощь окружающих позволят Вам даже горы свернуть на своем пути. Во вторник Вас могут ожидать поездки и командировки, которые позволят не только успешно потрудиться, но и славно отдохнуть. В среду хорошо заниматься разрушением старого и созиданием нового.

РЫБЫ

Практически вся неделя, за исключением понедельника, будет окрашена в благоприятные для Вас цвета. В понедельник лучше не показываться на глаза начальству, чтобы избежать конфликтной ситуации. Во вторник Вам многое будет по плечу. Усилия, совершенные в этот день, принесут неожиданно богатые плоды. В среду лучше пожалеть себя и позволить себе небольшой отдых за городом. Четверг - прекрасный день для проявления Ваших творческих замыслов. В четверг Вам может понадобиться совет и помощь верных друзей, и Вы это все получите.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
...........(017)210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
10 кастрычніка 2001г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
НАКЛАД 11.000 экз.
ЗАКАЗ № 3297
© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы
Аб'ём — тры друкаваныя аркушы

E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by ПЭЙДЖЭР: 8-22-730000 аб. 95196